

# КАБ ЗВЕРЫЦЬ ГАДЗІННІКІ

**Прэзідэнт сустрэўся з кіраўніком Службы знешняй разведкі Расіі**

(Працяг на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 КРАСАВІКА 2025 г. СЕРАДА № 74 (30462)

ПАДЗЕЯ

# ПЕРАДАВЫЯ ПРАКТЫКІ І ІНАВАЦЫЙНЫЯ ПРАДУКТЫ

**У Мінску адкрыўся міжнародны медыцынскі форум «Ахова здароўя»**

У сталіцы адкрыўся 30-ы юбілейны міжнародны медыцынскі форум «Ахова здароўя Беларусі — 2025». Сёлета ў выстаўцы бяруць удзел каля 190 экспанентаў з 8 краін — Беларусі, Расіі, Кітая, Егіпта, Ірана, Турцыі, Венгрыі і Швейцарыі. Сярод іх вядучыя айчынныя вытворцы медыцынскай тэхнікі, вырабаў медыцынскага прызначэння, расходных матэрыялаў, стаматалагічнага абсталявання і фармацэўтычнай прадукцыі.

СТАР. 5






КАНЦЭРТ-РЭКВІЕМ «КОЖНЫ ТРЭЦІ»

6



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ТЭНДЭНЦЫІ

# АЎТАРЫНАК ПРАЦЯГВАЕ РАСЦІ

**Летась продажы падвоіліся**

Аўтамабільная асацыяцыя «БАА» падвяла вынікі продажаў 2024 года. Летась аўтадылеры рэалізавалі 53178 новых легкавых і лёгкіх камерцыйных аўтамабіляў. Гаворка ідзе пра аўто, якія былі пастаўлены ў Беларусь па афіцыйных каналах або зробленыя ў Беларусі. Гэта больш чым удвая перавышае паказчык 2023-га, калі было прададзена 25408 машын, адзначыў Дзмітрый ЯРОТА, дырэктар УП «БАА-Кансалт».



СТАР. 12

ISSN 1990 — 763X
25074>

# КАБ ЗВЕРЫЦЬ ГАДЗІННІКІ

**Прэзідэнт сустрэўся з кіраўніком Службы знешняй разведкі Расіі**

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з кіраўніком Службы знешняй разведкі Расійскай Федэрацыі Сяргеем Нарышкіным, які прыехаў у Мінск для ўдзелу ў сумесным пасяджэнні калегіі яго ведамства з Камітэтам дзяржаўнай бяспекі Беларусі. Але найперш — сустрэча з кіраўніком дзяржавы.



**«Заўсёды прыемна сустрэцца з вамі, чакаю такой сустрэчы, калі даецца такая магчымасць для таго, каб і гадзіннікі зверыць, і параіцца па некаторых пытаннях. І паглядзець недалёкую перспектыву: як мы будзем дзейнічаць, што рабіць, абмеркаваць шэраг палітычных пытанняў, асабліва ў гэтай турбулентнай**

## СУПРАЦОЎНІЦТВА СПЕЦСЛУЖБАЎ БУДУЕЦЦА НА КАНСТРУКТЫЎНАЙ

Журналістам Сяргей Нарышкін расказаў, што на сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі абмяркоўваліся пытанні, якія датычацца рэгіянальнай і глабальнай бяспекі. «Аляксандр Рыгоравіч падтрымаў і заўсёды падтрымлівае сумесную дзейнасць спецслужбаў нашых дзяржаў па забеспячэнні бяспекі нашых дзяржаў, Саюзнай дзяржавы», — сказаў Сяргей Нарышкін.

Журналісты пацікавіліся меркаваннем кіраўніка Службы знешняй разведкі накont таго, як супрацоўніцтва спецслужбаў дазваляе гарантаваць бяспеку Саюзнай дзяржавы ва ўмовах нарастання эскалацыі з боку калектыўнага Захаду.

**«Супрацоўніцтва спецслужбаў нашых дзяржаў будуецца на канструктыўнай і даверназ аснове, з кожным годам развіваецца і пашыраецца па кірунках сваёй дзейнасці. Гэта ўзаемадзеянне з'яўляецца і працягам, адлюстраваннем даверных адносін паміж лідарамі нашых краін. Перад Камітэтам Дзяржаўнай бяспекі Беларусі і Службай знешняй разведкі Расіі стаяць няпростыя стратэгічныя задачы па забеспячэнні бяспекі, па супрацьдзеянні агрэсіўным памкненням недружалюбных дзяржаў. У гэтым кірунку зроблена ўжо даволі шмат.**

Але пры гэтым мы бачым і павышэнне ваеннай актыўнасці дзяржаў НАТА каля нашых граніц, мы бачым, што еўрапейскія краіны — Францыя, Вялікабрытанія, Германія, павышаюць узровень эскалацыі ўкраінскага канфлікту. Таму нам трэба дзейнічаць на апярэджанне. Мы да гэтага гатовы», — адзначыў Сяргей Нарышкін.

У кантэксце ўкраінскага канфлікту журналісты пацікавіліся, як дыялог паміж ЗША і Расіяй, які зараз ідзе даволі інтэнсіўна, можа рэальна пасадзейнічаць у вырашэнні ўкраінскага канфлікту. Сяргей Нарышкін заўважыў, што ўжо сам факт кантактаў з'яўляецца станоўчым. «І, вядома, ён рэзка кантрастуе з тым, што было пры ранейшай адміністрацыі прэзідэнта Байдэна, якая за чатыры гады ў літаральным сэнсе разбурыла міждзяржаўныя сувязі паміж Расіяй і ЗША, — адзначыў ён. — Расія пагадзілася з прапановай прэзідэнта Трампа аб абвяшчэнні 30-дзённага мараторыя на атакі па аб'ектах энергетычнай інфраструктуры. Расія выконвае свае абавязкі, але пра ўкраінскую армію гэтага сказаць нельга. Мы разумеем, што адміністрацыя і кіраўніцтва Украіны хоча працягу канфлікту, і разумеем чаму: толькі ў такіх умовах цяперашняя кіеўская ўлада застанецца ў сваіх кабінетах і не будзе адказваць за злачынныя рашэнні перад сваім народам». Гаворачы пра стратэгічныя мэты Расіі пасля завяршэння канфлікту, Сяргей Нарышкін падкрэсліў, што яны застаюцца ранейшымі.

**«Умовы мірнага пагаднення прадугледжваюць бяз'ядзерны нейтральны статус Украіны. Мілітарызацыю і дэнацыфікацыю ўкраінскай дзяржавы, а значыць, адмену ўсіх дыскрымінацыйных законаў, якія былі прыняты пасля дзяржаўнага перавароту ў 2014 годзе», — растлумачыў кіраўнік Службы знешняй разведкі.**

Журналісты таксама спыталі пра тое, як Сяргей Нарышкін ацэньвае сітуацыю вакол Саюзнай дзяржавы, улічваючы і агрэсіўную рыторыку Польшчы і краін Балтыі. Ён адзначыў, што Польшча і Балтыйскія рэспублікі адрозніваюцца высокай агрэсіўнасцю, ва ўсякім разе, на словах. «Польшча дайшла да таго, што заяўляе аб сваіх планах каля граніц Беларусі і Калінінградскай вобласці ўстанавіць каля двух мільёнаў супрацьтанкавых мін і вельмі спадзяецца атрымаць амерыканскую ядзерную зброю. Гэта, безумоўна, вельмі сумна. Яны ніяк не могуць зразумець, што менавіта нарошчванне ваеннай актыўнасці каля граніц Расіі і Беларусі стала адной з прычын небяспечнага крызісу на еўрапейскім кантыненце. І яны павінны зразумець (а пакуль не разумеюць), што ў выпадку агрэсіі з боку паўночнаатлантычнага альянса ў адрас саюзнай дзяржавы ўрон будзе нанесены ўсяму блоку НАТА. У большай ступені найперш пацерпяць носьбіты такіх ідэй у палітычных колах Польшчы і Балтыі», — заявіў Сяргей Нарышкін.

Спыніліся і на больш стваральных пытаннях — захаванні памяці аб подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне і недапушчэнні гераізацыі нацызму.

**«Служба знешняй разведкі адстойвае праўду. Мы праводзім вялікую работу з архіўнымі матэрыяламі, якія ёсць у нас. Архіўныя дакументы з'яўляюцца адным з наймацнейшых інструментаў, што не дазваляюць**



**сітуацыі. Думаю, для мяне вельмі важны будзе ваш пункт гледжання», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.**

Ён папрасіў Сяргея Нарышкіна па вяртанні ў Маскву перадаць прывітанне і самыя цёплыя словы Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну. «Хоць мы часта размаўляем па тэлефоне, тым не менш гэта будзе да месца ў сілу нашых адносін», — адзначыў беларускі лідар.

У сваю чаргу Сяргей Нарышкін падзякаваў за гэту сустрэчу і перадаў прывітанне ад Уладзіміра Пуціна. Ён таксама павіншаваў Аляксандра Лукашэнка з перамогай на выбарах: «Мы не сумняваліся ў выніках. Але перамога пераканаўчая, якая паказвае, што насельніцтва Беларусі, выбаршчыкі падтрымліваюць і ўнутрыпалітычны, і знешнепалітычны курс краіны, які вызначае Прэзідэнт», — сказаў кіраўнік СЗР Расіі.

## АСНОВЕ

**падвяргаць сумневу перамогу савецкага народа і подзвігу пакалення пераможцаў», — расказаў Сяргей Нарышкін.**

Ён таксама падзяліўся, што Служба знешняй разведкі выкарыстоўвае такі інструмент, як стратэгічнае рассакрэчванне актуальнай разведвальнай інфармацыі.

**«Справа ў тым, што, на жаль, у многіх заходніх краінах, Польшчы, прыбалтыйскіх рэспубліках будуюцца планы, нацэленыя на тое, каб сарваць урачыстыя мерапрыемствы з нагоды юбілею Вялікай Перамогі або перашкодзіць ім.**

Даходзіць да таго, што шэраг краін плануюць знішчыць воінскія пахаванні салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі, якія вызвалілі гэтыя краіны ад фашызму. Гэта, безумоўна, ганебна», — сказаў кіраўнік СЗР.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

АКЦЭНТЫ

# «КОЖНЫ КІРУНАК ПАВІНЕН ЗАБЯСПЕЧВАЦЬ СТАНОЎЧЫ ВЫНІК»

## Белпошта 2.0: што чакае паштовы сектар?

На нарадзе ў Прэм'ер-міністра Аляксандра Турчына ўчора абмеркавалі будучыню пошты — ад традыцыйных лістоў да лічбавых сэрвісаў і e-commerce.

Як паведамілі ў прэс-службе ўрада, з кіраўніцтвам Мінсувязі і Белпошты дэталёва разгледжаны асноўныя кірункі павышэння эфектыўнасці функцыянавання нацыянальнага паштовага аператара, у тым ліку з улікам змянення падыходаў да аказання шэрагу традыцыйных паштовых паслуг.

Асобная ўвага ўдзелена аказанню паслуг па перасылцы пісьмовай карэспандэнцыі і дастаўцы сродкаў масавай інфармацыі разам з актыўным развіццём лічбавых паслуг і сэрвісаў.

— Кожны кірунак павінен забяспечваць станоўчы вынік з улікам стратэгічных рашэнняў па яго развіцці, — падкрэсліў Прэм'ер-міністр.

Як адзначыла гендырэктар Белпошты Святлана Юркевіч, дзякуючы развітой інфраструктуры і лагістыцы Белпошта актыўна ўдзельнічае ў сегменце электроннага гандлю, забяспечвае ва ўзаемадзеянні з электроннымі пляцоўкамі дастаўку заказаў да кожнага населенага пункта краіны, а таксама развівае ўласны інтэрнэт-магазін, рэалізуючы там як паштовую прадукцыю, так і спажывецкія тавары беларускіх вытворцаў.

ПАДЗЕЯ

# «КАБ ПАМЯЦЬ ПРА ПОДЗВІГ НАРОДА ЖЫЛА...»

## Як рыхтуюць пляцоўку пад галоўную выстаўку да Дня Перамогі?

Хутка на плошчах міжнароднага выставачнага цэнтра ў Мінску разгорнецца ўнікальная экспазіцыя, якая будзе адпавядаць маштабу 80-годдзя Вялікай Перамогі. Такое даручэнне даў кіраўнік дзяржавы. Як яно выконваецца, ацаніў намеснік Прэм'ер-міністра Уладзімір Каранік, пабываўшы на пляцоўцы.

У гутарцы з журналістамі ён адзначыў, што тут плануецца рэалізацыя ўнікальнага праекта, які будзе адпавядаць маштабу 80-годдзя Вялікай Перамогі:

— Выстаўка, якая дазваляе акунуцца ў асноўныя вехі Вялікай Айчыннай вайны, зразумець жахі вайны, ацаніць подзвіг савецкага народа. Менавіта асноўныя вехі тых вогненных гадоў мы павінны максімальна рэалістычна, максімальна гістарычна дакладна перадаць наступным пакаленням, нашаму маладому пакаленню, каб памяць пра подзвіг народа жыла ў вяках.

Уладзімір Каранік акцэнтаваў увагу на важнасці рэалізацыі ўсіх задуманых праектаў:

— Тут шмат інавацыйных падыходаў да арганізацыі выстаўкі, і наша задача — забяспечыць дакладную каардынацыю ўсіх: будаўнікоў, спецыялістаў вэб-дызайну, проста дызайнераў, тых, хто стварае малыя архітэктурныя формы, — для таго, каб гэта была суцэльная экспазіцыя, якая пакідае вельмі глыбокае эмацыянальнае ўражанне пасля наведвання.

Паводле яго слоў, практычна поўная гатоўнасць выстаўкі павінна быць да 1 мая.

— Каб у нас яшчэ застаўся тыдзень на тонкае даналаджванне, — растлумачыў віцэ-прэм'ер.

НА КАНТРОЛІ

# ДЗЕЛЯ АХОВЫ ПРАВОЎ І ЗАКОННЫХ ІНТАРЭСАЎ

## 14 красавіка Прэзідэнт падпісаў указ, згодна з якім у Беларусі створана дзяржаўная камісія па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзеннем уступнай кампаніі ў 2025 годзе

Дзяржкамісія пракантралюе арганізацыю ўступных выпрабаванняў, у тым ліку цэнтралізаваны экзамен (ЦЭ), які стартуе ў канцы мая. Таксама камісія ўдзяляць увагу прыёму дакументаў і залічэнню абітурыентаў у ВНУ і ССНУ. Старшынёй камісіі прызначаны намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Каранік. У яе складзе — прадстаўнікі Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, міністр адукацыі Андрэй Іванец, прадстаўнікі міністэрстваў, ведамстваў, абласной выканаўчай улады, Камітэта дзяржаўнага кантролю, парламента і іншых.

У гэтым годзе, як і ў ранейшыя, асноўнай задачай камісіі будзе забеспячэнне кантролю за падрыхтоўкай і правядзеннем цэнтралізаваных экзамену і тэсціравання. Напрыклад, за выкананнем правілаў пры пропуску абітурыентаў у пункты тэсціравання, іх рассаджванні падчас правядзення выпрабавання, прыняцце мер па ліквідацыі парушэнняў заканадаўства і іншыя. Сачыць за ходам экзаменаў будуць і на іншых уступных іспытах, якія прадугледжаны для абітурыентаў, якія паступаюць на пэўны шэраг спецыяльнасцяў — філалогія, архітэктура, фізічная культура, творчыя спецыяльнасці і іншыя.

— Гэтыя і іншыя мерапрыемствы служаць адзінай важнай мэце, — зазначыў **член пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл Мірончык.** — Каб уступныя выпрабаванні, незалежна ад месца і формы іх правядзення, прайшлі ў спакойнай рабочай абстаноўцы і ў поўнай адпаведнасці з устаноўленым парадкам.

Дарэчы, Міхаіл Уладзіміравіч таксама ўваходзіць у склад Дзяржаўнай камісіі, і ён запэўніў, што з боку яе членаў будуць прадпрыняты ўсе неабходныя намаганні, каб у кожнай навучальнай установе былі створаны справядлівыя і роўныя ўмовы для абітурыентаў. Ён таксама расказаў, што з пачаткам уступнай кампаніі асноўны сродак зносін — гэта дыялог з абітурыентамі і іх законнымі прадстаўнікамі.

— Звяртаў у гэты «гарачы» перыяд паступае вельмі шмат, — расказвае парламентарый. — Любое з іх мы разглядаем аператыўна. Працуем адкрыта, максімальна празрыста.

Летась Міхаіл Мірончык кантраляваў установы адукацыі, якія рыхтуюць спецыялістаў для сферы культуры.

— Калі гаворка ідзе аб цэнтралізаваным тэсціраванні — там усё ясна, — расказвае ён. — Сумоўе, ацэнка мастацкіх работ, танец або выкананне на музычным інструменце — гэта ўжо сур'ёзна. Вядома, узровень здольнасцяў маладых людзей ацэньваюць спецыялісты. Цяжка ацаніць справядлівасць гэтай ацэнкі. Але гэта наш абавязак. Такі вопыт для мяне быў вельмі карысны.

Нагадаем, традыцыйна ўступная кампанія сёлета пачалася з рэгістрацыі на цэнтралізаванае тэсціраванне 9 красавіка, а завершыцца 22 красавіка. ЦТ і ЦЭ абітурыенты будуць здаваць у канцы мая — пачатку чэрвеня. Пасля гэтага пачнецца прыём дакументаў у ВНУ і ССНУ. Першымі па ўжо існуючай традыцыі паступаюць мэтавікі: у гэтым годзе прыём дакументаў у іх з 27 чэрвеня па 2 ліпеня, экзамены — з 4 па 10 ліпеня, залічэнне — па 12 ліпеня. З 12 ліпеня па 3 жніўня пройдзе асноўны этап прыёмнай кампаніі ва ўніверсітэтах. У каледжах прыёмная кампанія на ўзровень ПТА пачнецца 15 чэрвеня і завершыцца 23 жніўня. Ва ўстановах ССА прыём будзе праходзіць з 18 ліпеня па 6 жніўня. Агульны план набору ў ВНУ ў 2025 годзе — 48,3 тысячы студэнтаў. У каледжах на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі плануецца прыняць каля 28 тысяч абітурыентаў, на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі — 38 600 чалавек.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

# УНІКАЛЬНАЯ СТАРОНКА Ў ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

## У Савеце Рэспублікі адбылося адкрыццё выстаўкі «Подзвігі і лёсы партызан у дакументах»

Гэта выстаўка заснавана на матэрыялах унікальнага інтэрнэт-праекта Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» і Нацыянальнага архіва «Партызаны Беларусі». На ёй прадстаўлены ўнікальныя гістарычныя фатаграфіі часоў Вялікай Айчыннай вайны, узнагародныя лісты і баявыя характарыстыкі партызан і падпольшчыкаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай. Гэтыя дакументы раскрываюць подзвігі і заслугі канкрэтных партызан, расказваюць аб партызанскіх фарміраваннях і іх баявых сутыкненнях з акупантамі.



Фота sb.by

Гісторыі людзей, якія сыходзілі ў партызанскія атрады, працавалі ў падполлі, — гэта цяжкая старонка ў гісторыі Беларусі, але гэта і наш гонар, сказала на адкрыцці выстаўкі **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.** Яна адзначыла, што Вялікая Айчынная вайна пакінула для ўсіх беларусаў незагойныя шрамы на сэрцах і ў душах:

**«З кожным годам я, як і кожны з нас, усё вастрэй гэта ўсведамляю, таму што адна справа, калі людзі прызываліся і ішлі ваяваць на фронт. І зусім іншая гісторыя, калі адразу ж на другі-трэці дзень бамбілі горад Мінск, наша Беларусь была акупаваная. Але нашы людзі... Беларусь акупаваная, а людзі супраціўляюцца!»**

Спікер Савета Рэспублікі падкрэсліла, што партызанскі рух і падполле — гэта ўнікальная старонка ў гісторыі Беларусі:

**«Гэтыя людзі выканалі цяжкую работу, часам нават не разумеючы і не ўсведамляючы, як гэта было цяжка. Гэта асаблівая старонка ў гісторыі. Для ўсіх нас гэта — генетычны код, калі мы разумеем, што трэба было лічыцца не з асабістым — як выратаваць сваё жыццё — а рабіць усё для Перамогі. І гісторыя людзей, якія сыходзілі ў партызанскія атрады, якія працавалі ў падполлі — гэта наш гонар. Гэта гонар за тых людзей, якія зрабілі ўсё для Перамогі. А яшчэ гэта і прыклад для нас — прыклад мужнасці, стойкасці, нязломнай волі».**

Наталля Качанава падзякавала арганізатарам за карпатлівую працу. «У нас у Савеце Рэспублікі бывае шмат гасцей і дэлегацый. Сюды часта прыходзіць моладзь, і ўсім будзе вельмі карысна азнаёміцца з гэтай выставай», — падагульніла яна.

Праект «Партызаны Беларусі» запусцілі пяць гадоў таму перад мінулым юбілеем Перамогі. Пра гэта расказаў **член Савета Рэспублікі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Беларусь сёння» Дзмітрый ЖУК:** «Гэта архіўная база ўзнагародных лістоў, асабістых спраў, характарыстык, баявых уліковых лістоў нашых партызан, тых, хто змагаўся ў партызанскіх атрадах. І сёння ў базе знаходзяцца дакументы амаль на 230 тысяч персон, адсканавана больш за 1,5 мільёна дакументаў. Гэта перш за ўсё ўзнагародныя лісты, гэта іх характарыстыкі. Але самае галоўнае — магчымасць для маладых людзей убачыць дакументы сваіх ужо, напэўна, прадзедаў, якія ваявалі. І гэта асабістае эмацыянальнае суперажыванне — найлепшы, на мой погляд, механізм захавання гістарычнай памяці».

Інтэрнэт-праект «Партызаны Беларусі» арыентаваны ў першую чаргу на маладзёжную аўдыторыю, падкрэсліў **дырэктар Нацыянальнага архіва Беларусі Андрэй ДЗЕМЯНЮК.** Ён расказаў, што Нацыянальны архіў Беларусі шчыльна ўзаемадзейнічае з рознымі навучальнымі ўстановамі.

ШЧЫРАЯ РАЗМОВА

# «САМАЕ ГАЛОЎНАЕ ДЛЯ ЛЮБОЙ КРАІНЫ — БЫЦЬ АБАРОНЕНАЙ, ЗРАБІЦЬ ТАК, КАБ НАРОД АДЧУВАЎ СЯБЕ СПАКОЙНА»

## Аб чым расказвала Наталля КАЧАНАВА навучэнцам Спецыялізаванага ліцэя МУС

У Савеце Рэспублікі прайшла сустрэча Наталлі Качанавай з выхаванцамі Спецыялізаванага ліцэя МУС. У ходзе адкрытага дыялогу, які доўжыўся больш за дзве гадзіны, спікер расказала пра дзейнасць палаты парламента, закранула моманты патрыятычнага выхавання моладзі, падрабязна і шчыра адказала на шматлікія пытанні, якія паступалі ад навучэнцаў.

Звяртаючыся да юных гасцей, **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** адзначыла:

**«Вы прынялі для сябе вельмі важнае рашэнне — пайсці вучыцца ў Спецыялізаваны ліцэй МУС, каб у далейшым звязаць свой лёс з нашымі органамі ўнутраных спраў. І я вельмі на гэта разлічваю, таму што самае галоўнае для любой краіны — быць абароненай, зрабіць так, каб народ адчуваў сябе спакойна. Малады чалавек павінен разумець, калі заканчвае сярэднюю школу або гімназію, куды пайсці далей, чым займацца ў гэтым жыцці. А вы ўжо для сябе вызначылі гэты кірунак, і гэта правільна».**

Спікер Савета Рэспублікі падкрэсліла, што сёння самае галоўнае — мір і спакой на нашай зямлі: «Вы гэта, напэўна, чуеце і ведаеце, пра гэта вам расказваюць выкладчыкі. Мы сустракаемся з вамі напярэдадні вялікага свята — Дня Перамогі. Гэта вялікае свята, таму што мы разумеем, што было б, калі б тады наш народ не перамог у той крывавай вайне. Мы павінны памятаць і шанаваць тыя добрыя справы, якія былі зроблены старэйшымі пакаленнямі».

Старшыня Савета Рэспублікі расказала навучэнцам ліцэя і аб заканатворчасці: «Наша дзяржава прававая, мы жывём паводле законаў. Таму законы павінны працаваць, і таму законы трэба прымаць такія, якія былі б на карысць нашага народа і нашай краіны.

**Прэзідэнт шмат разоў нам казаў, што ў аснове нашай палітыкі перш за ўсё — людзі, каб у людзей было камфортнае жыццё, каб яны жылі ў цудоўнай краіне, каб яны мелі добрую работу і годную заработную плату, добрыя ўмовы для жыцця. І таму кіраўніком дзяржавы аб'яўлены Год добраўпарадкавання і пяцігодка якасці. Сёння наша дзяржава накіроўвае сродкі на ўстановы адукацыі, на ахову здароўя, на забеспячэнне бяспекі нашай краіны. Каб людзі жылі ў міры і згодзе. А каб вырашыць усе гэтыя задачы, павінна працаваць эканоміка. І перш за ўсё самая галоўная задача для таго, каб мы жылі добра, — павінны працаваць прадпрыемствы, якія ствараюць даброты для нашай краіны».**

Падчас сустрэчы кожны з прысутных мог задаць Наталлі Іванаўне абсалютна любыя пытанні. І галоўнае пытанне, якое хвалявала ліцэістаў, — чаму пачынаюцца войны? На думку спікера Савета Рэспублікі, прычына войнаў і рознагалоссяў — «брудная» палітыка: «Гэта ж не людзі прымаюць рашэнне развязаць вайну, а тыя, хто стаяць ва ўладзе. І калі такія працэсы, якія складана ўрэгуляваць, ідуць унутры краіны, тады палітыкі робяць усё для таго, каб абвінаваціць у сваіх праблемах іншыя краіны. Паглядзіце, што сёння кажуць палякі, іншыя нашы заходнія суседзі. Яны будуць бараніцца ад нас, беларусаў. Гэтым яны нагнятаюць абстаноўку, пачынаюць збіраць узбраенне.

**Наш Прэзідэнт усюды кажа: «Мы ні на каго не збіраемся нападаць. Мы заўсёды будзем жыць у міры і згодзе з усімі, хто канструктыўна настроены на супрацоўніцтва з нашай краінай. І наш Прэзідэнт, на мой погляд, — гэта вялікі палітык у свеце. Калі палітыка ў краіне выбудоўваецца такім чынам, як выбудоўвае яе наш кіраўнік дзяржавы, — гэта залог таго, што мы будзем жыць мірна».**

Матэрыялы падрыхтаваў Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.

# ПЕРАДАВЫЯ ПРАКТЫКІ І ІНАВАЦЫЙНЫЯ ПРАДУКТЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*





Форум — гэта выдатная прэзентацыйная пляцоўка для кампаній, якія выпрацоўваюць або пастаўляюць фармпрадукцыю, медабсталяванне, матэрыялы і інструменты, а таксама інавацыйныя распрацоўкі і IT-рашэнні ў галіне аховы здароўя. Праграма ўключае ў сябе выстаўку і шырокую дзелавую праграму, у рамках якой сёлета пройдзе каля 30 навукова-практычных канферэнцый, семінараў і прэзентацый.

У прывітальным адрасе, які накіравала ўдзельнікам форуму **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА,** падкрэслівалася, што падобныя мерапрыемствы становяцца платформай для эфектыўнага ўкаранення перадавых практык, выпрацоўкі стратэгій, накіраваных на комплекснае пашырэнне прафесійных кампетэнцый. «На працягу трох дзесяцігоддзяў форум збірае ў нашай сталіцы высокакваліфікаваных урачоў, вядучых вытворцаў спецыяльнага абсталявання, прадстаўнікоў фармацэўтычных кампаній і адукацыйных устаноў. Гэта знакавая падзея адкрывае ўнікальныя магчымасці для дасягнення навуковых мэт, устанаўлення партнёрскіх кантактаў і прасоўвання інавацыйных прадуктаў практычнай медыцыны. Сёння менавіта вы стаіце на варце самага каштоўнага — жыцця людзей», — адзначыла Наталля Качанава, дадаўшы, што беларускія спецыялісты штодзённа прадстаўляюць даступную і якасную медыцынскую дапамогу грамадзянам, актыўна прымяняюць найноўшыя тэхналагічныя распрацоўкі, пацвярджаючы высокі статус сацыяльна арыентаванай дзяржавы.

**Міністр аховы здароўя Аляксандр ХАДЖАЕЎ** звярнуў увагу на той факт, што за мінулы год да беларускіх медыкаў звярнуліся па дапамогу больш за 160 тысяч замежных грамадзян са 159 краін свету. Гэта сведчыць пра тое, што наша медыцына карыстаецца ва ўсім свеце.

— І дзякуючы такому маштабнаму мерапрыемству, як сённяшняя выстаўка, мы можам дасягаць вынікаў, якія датычацца ўкаранення сучасных тэхналогій, матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, і аказваць якасныя медыцынскія паслугі ў першую чаргу нашым грамадзянам і тым, хто мае ў ёй патрэбу з іншых краін, — адзначыў Аляксандр Хаджаеў.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Валерый МАЛАШКА** акцэнтаваў увагу на тое, што на выстаўцы прадстаўлены найлепшыя ўзоры беларускай медыцынскай тэхнікі, лекавых прэпаратаў, якія былі распрацаваны ў тым ліку ў апошнія гады і ўкаранёны ў практычную ахову здароўя.

— Выстаўка абазначыла сур'ёзную дзелавую праграму і людзям, якія глядзяць у будучыню, будзе цікавая частка, дзе прадстаўлены стартапы ў галіне сістэмы аховы здароўя. Прадстаўнікі практычнай аховы здароўя знойдуць тут усё тое, што дапаможа ім развіваць галіну ў рэгіёнах і, вядома ж, дапамагаць у развіцці нашым суседзям, аказваць дапамогу нашым грамадзянам і замежным гасцям, — упэўнены Валерый Малашка.

Намеснік Генеральнага сакратара Кітайскай асацыяцыі медыцынскага абсталявання Жэнь Фан расказала, што ў выстаўцы ўдзельнічае 7 кітайскіх вытворцаў медтэхнікі і абсталявання і прадстаўлена прадукцыя 15 кампаній. Форум працягне сваю работу ў сталічным футбольным манежы да 18 красавіка.

**Алена КРАВЕЦ.**

УРАЖАННІ

# «ДЗЯКУЙ ПРЭЗІДЭНТУ ЗА МАГЧЫМАСЦЬ!»

## На экскурсію ў Палац Незалежнасці завіталі медыкі

Наведаць Палац Незалежнасці гэтым разам выдалася магчымасць работнікам Гомельскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы — найстарэйшай дзіцячай бальніцы ў краіне — якраз учора споўнілася 105 гадоў з дня адкрыцця гэтай установы. Гасцямі Палаца таксама сталі ўдзельнікі XXX юбілейнай выстаўкі-форуму «Ахова здароўя Беларусі», а менавіта гродзенскія ўрачы анка- і кардыядыспансераў, урачы і спецыялісты Віцебскай і Мінскай бальніц хуткай медыцынскай дапамогі, якія выратавалі людзей пасля пажару ў гандлёвым цэнтры ў Віцебску, а таксама прадстаўнікі трох унікальных РНПЦ — дзіцячай хірургіі, кардыялогіі, неўралогіі і нейрахірургіі, на рахунку якіх сотні ўнікальных аперацый.

Экскурсія пачалася традыцыйна ў Зале ўрачыстых цырымоній. Тут гасцям расказалі гісторыю ўзвядзення рэзідэнцыі Прэзідэнта. Рашэнне аб будаўніцтве Палаца Незалежнасці было прынята Аляксандрам Лукашэнкам у 2011 годзе. Пастаўленую Прэзідэнтам задачу беларускія майстры выканалі хутка, і, што не менш важна, якасна: замест запланаваных 57 месяцаў яго пабудавалі за 30 — ужо ў кастрычніку 2013-га пляцоўка адчыніла свае дзверы для першых высокіх гасцей, а некалькі гадоў таму па распараджэнні Прэзідэнта — і для звычайных беларусаў.

Падчас экскурсіі **намеснік галоўнага ўрача Гомельскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Аляксандр ДЗЯЖУРКА** расказаў, што неаднаразова бачыў Палац Незалежнасці здалёк, але на экскурсію прыехаў разам з калегамі ўпершыню: «Яна для нас знакавая, таму што прымеркаваная да 105-годдзя адкрыцця бальніцы — 15 красавіка 1920 года яна прыняла сваіх першых пацыентаў». Паводле слоў госця, сёння штат бальніцы налічвае больш за 1 100 работнікаў, якія неаднаразова станавіліся прызёрамі і пераможцамі галіновых спаборніцтваў — «Лепшая медыцынская сястра», «Лепшая арганізацыя аховы здароўя па развіцці інстытута настаўніцтва» і не толькі.







На пытанне аб першых уражаннях ад наведвання рэзідэнцыі Прэзідэнта, гамяльчанін адказаў так: «У Беларусі, нашай маладой у параўнанні з іншымі дзяржаве, абавязкова павінна быць такая велічная пляцоўка. Тут адчуваецца беларускі дух, стыль». Асабліва госцю спадабалася, што ўбачыць палац не толькі звонку, але і наведаць вядомыя для многіх залы, ёсць магчымасць у кожнага беларуса. Гэта зноў падкрэслівае: хоць рэзідэнцыя Прэзідэнта — пляцоўка цэнтральная, статусная, але ні ў якім разе не адасобленая.

Госці былі прасякнуты атмасферай усіх залаў, якія наведалі. Іх увагу прыцягвалі нацыянальныя матывы, якія прасочваюцца паўсюль, нягледзячы на тое, што ўсе інтэр'еры Палаца Незалежнасці выкананы ў класічным стылі, што абумоўлена афіцыйнасцю пабудовы.

Маштаб, веліч і ўвага да дэталяў — вось што асабліва ўразіла падчас экскурсіі **старшыню першаснай прафсаюзнай арганізацыі Гомельскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Вольгу ВОЗЧЫКАВУ:** «Ганаруся яшчэ і тым, што гэта прыгажосць створана рукамі беларусаў», — адзначыла жанчына.

У першы раз у Палацы Незалежнасці ўчора пабывала **вядучы навуковы супрацоўнік, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі Людміла НОВІКАВА:** «Я вельмі шчаслівая прадстаўленай магчымасці трапіць у такі значны для краіны будынак, дзе прымаюцца найважнейшыя рашэнні, праходзяць мерапрыемствы з удзелам нашага Прэзідэнта. Вельмі ганаруся тым, што пабывала тут. Палац здзіўляе сваёй прыгажосцю, архітэктурай, інтэр'ерам. Ён унутры прасякнуты нашым нацыянальным духам», — з захапленнем адзначыла жанчына.

Для гамяльчанкі Святланы таксама гэты дзень запомніцца надоўга: «Нарэшце мы прыехалі ў Мінск! У палацы так светла, утульна, сапраўды, што экскурсія праляцела, здаецца, як адно імгненне. Ганаруся, што пабывала тут, ды яшчэ і калі — у дзень юбілею адкрыцця нашай бальніцы! Дзякуй Прэзідэнту за магчымасць!»

**Яна ВАЛАСАЧ, фота аўтара.**

# «ВА ЎСІХ БЫЛІ СЛЁЗЫ НА ВАЧАХ...»

## Дадатковы канцэрт-рэквіем «Кожны трэці» зноў прайшоў для мінчан

Канцэрт-рэквіем «Кожны трэці», які па даручэнні кіраўніка дзяржавы паказалі прадстаўнікам усіх рэгіёнаў краіны, прайшоў у Палацы Рэспублікі восьмы раз. Гэтым разам — зноў для мінчан. І не дзіўна, бо, як адзначаюць арганізатары, аднаго канцэрта для двухмільённай сталіцы сапраўды недастаткова. Гледачамі дадатковага канцэрта сталі пераважна прадстаўнікі маладога пакалення. Музыка, дакументальныя кадры і факты з мінулага — усё гэта стала для юных гледачоў не проста пастаноўкай, а асабістым перажываннем і напамінам аб найважнейшых старонках беларускай гісторыі.



### ПА ПРОСЬБЕ ГОРАДА — ДАДАТКОВЫ ПАКАЗ

Канцэрт-рэквіем «Кожны трэці» атрымаў настолькі шырокі водгук, што па просьбах мінчан быў арганізаваны дадатковы, восьмы паказ. Пра гэта перад пачаткам мерапрыемства расказала **генеральны прадзюсар праекта Ганна ЛУКАШЭНКА:** «Дзякуючы грамадскаму рэзанансу, які ўзнік у першыя дні праекта, пачало паступаць шмат просьбаў аб працягу паказу, гледачы прасілі яшчэ. Найбольш актыўным аказаўся горад Мінск: для двухмільённага насельніцтва аднаго паказу на 2,5 тысячы гледачоў сапраўды аказалася недастаткова. Па просьбе горада сёння праходзіць дадатковы паказ, арыентаваны пераважна на маладзёжную аўдыторыю: вучняў старшых класаў і студэнтаў».

Яна адзначыла, што канцэрт-рэквіем «Кожны трэці» ўбачылі ўжо каля 20 тысяч чалавек: «Наша задача — расказаць як мага большай колькасці людзей гэту страшную праўду. Я думаю, што кожны глядач па прыездзе дадому распавёў аб праекце сваім блізкім, а тыя — камусьці яшчэ».

Эмацыйны водгук гледачоў, паводле слоў генеральнага прадзюсара, аказаўся глыбокім, але цалкам чаканым: «Гэты канцэрт выклікае такія ж пачуцці і ў нас, у арганізатараў, у артыстаў. Яшчэ на этапе рэпетыцый, нават без экранаў, ва ўсіх былі слёзы на вачах. Мы пражываем кожны канцэрт. І глядач пражывае яго разам з намі. Тыя кадры, гістарычныя дакументы не могуць не закрануць асабістае».

Ганна Лукашэнка таксама падкрэсліла, што цяпер ідзе падрыхтоўка да новага паказу канцэрта-рэквіема «Кожны трэці» ў Маскве: «У нас ёсць дамоўленасць з Вялікай залай Крамлёўскага палаца ў Маскве. Канцэрт пройдзе там у верасні 2025 года пры падтрымцы Саюзнай дзяржавы, Міністэрстваў культуры Беларусі і Расіі, а таксама Міністэрства абароны, якое аказала нам вялікую дапамогу — як дакументальнымі кадрамі, так і дэкарацыямі».

### «МЫ ПАВІННЫ ЗАХАВАЦЬ ГЭТУ ПАМЯЦЬ»

**Намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Андрэй СТРЫГЕЛЬСКІ,** які прысутнічаў на паказе, звяртаючыся да гледачоў, адзначыў: «Мы з вамі шчаслівыя людзі, таму што жывём у такой краіне. Краіне, дзе моладзь атрымлівае якасную адукацыю і медыцынскую дапамогу, у краіне, дзе мы спакойна гадуем дзяцей, гуляем па ўтульных камфортных вуліцах, адчуваем сябе ў абсалютнай бяспецы. Але так было не заўсёды. У гісторыі нашай краіны ёсць самы страшны перыяд — Вялікая Айчынная вайна».

«Менавіта маладому пакаленню перадаваць гэту памяць наступным пакаленням, — сказаў Андрэй Стрыгельскі. — Мы павінны памятаць кожнага загінулага, кожнага закатаванага. Мы павінны берагчы кожны кавалак нашай шматпакутнай зямлі для таго, каб такая трагедыя больш ніколі не паўтарылася. Я прашу вас, заклікаю пранесці гэту памяць скрозь гады».



Адзін са складнікаў праекта «Кожны трэці» — тэматычныя выстаўкі. **Генеральны дырэктар інфармацыйнага агенцтва БелТА Ірына АКУЛОВІЧ,** прадстаўляючы экспазіцыю БелТА «Лёсы, складзеныя ў трохкутнік», зачытала ліст ваенных гадоў ад 18-гадовага хлопца з Татарстана да сваіх блізкіх. Праз 5 дзён пасля таго, як ён адправіў яго сваёй маме, хлопец загінуў тут, у нас у Беларусі. 17 падобных гісторый перапіскі байцоў са сваімі роднымі былі прадэманстраваны на выстаўцы.

Ірына Акуловіч адзначыла: «Мы хацелі, каб тыя, хто прыйшоў на канцэрт-рэквіем, адчулі ўсё гэта яшчэ глыбей, акунуліся ў гісторыю тых жудасных падзей. Таму далі магчымасць наведвальнікам напісаць падобныя трохкутнікі, але ўжо для сваіх блізкіх. Вядома, мы іх не чытаем, але ўпэўненыя, што ў іх памяць і боль. Таму што тая трагедыя закранула кожную беларускую сям'ю».

### «АДРАЗУ ЎСПОМНІЛА, ЯК ДЗЯДУЛЯ РАСПАВЯДАЎ МНЕ, ШТО ПЕРАЖЫЎ У ДЗЯЦІНСТВЕ...»

Зала поўная — у асноўным падлеткі, якія прыйшлі не проста паглядзець канцэрт, а па-сапраўднаму пражыць яго. **Дзевяцікласніца школы № 62 г. Мінска Лізавета Лазоўская** адзначае: да такога нельга быць гатовым, таму што гэта не проста сцэна і святло, гэта гісторыя, якая ўваходзіць у сэрца. «Мяне рэальна кранула. Было настолькі шчыра і глыбока, што часам хацелася плакаць. Фармат зусім асаблівы: калі гучыць не проста музыка, а за ёй стаяць сапраўдныя кадры, лёсы. Гэта пераварочвае ўсё ўнутры. Мы чуем не толькі голас выканаўцы, але і голас часу», — расказала яна.

Аднакласніца дзяўчыны **Вікторыя Казачонак** прызнаецца, што падчас аднаго з нумароў сядзела і плакала: «Адразу ўспомніла, як дзядуля распавядаў мне, што перажыў у дзяцінстве. Ён быў вязнем канцлагера. Памятаю, казаў, што хлеба давалі маленькі кавалачак на тыдзень... А сёння я ўбачыла гэта не як аповед, а як рэальную сітуацыю, быццам сама там пабывала. Гэта не проста сцэна, гэта гісторыя».

Для яшчэ адной **школьніцы Дыяны Сезонавай** такія канцэрты не проста эмацыйная падзея, а частка ўсвядомленага шляху: «У нас у школе часта праводзяць сустрэчы з ветэранамі, былымі вязнямі канцлагераў. Калі ты слухаеш іх, ловіш кожную дэталь, якая нідзе больш не паўторыцца. Гэта не параграф з падручніка, гэта чалавечая праўда. І калі потым бачыш такую ж праўду на сцэне — збіраецца поўная карціна. І ты ўжо не проста слухач. Ты ўдзельнік».

Усе тры дзяўчыны ўпэўненыя: расказваць пра вайну трэба не павучальна, а жыва і шчыра. Каб не забывалася. Каб было за што трымацца. Каб боль мінулага не стаў абыякавасцю ў сучаснасці.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## ХРОНІКА Вялікай ПЕРАМОГІ



### • На фронце

Паводле звестак Савецкага інфармбюро, на працягу 15 красавіка на Земландскім паўвостраве, на паўночным захадзе і захадзе ад Кёнігсберга, войскі 3-га Беларускага фронта, прадаўжаючы наступленне, з баямі занялі больш за 60 населеных пунктаў. У баях за 15 красавіка ў гэтым раёне франтавікі ўзялі ў палон больш за тры тысячы нямецкіх салдат і афіцэраў.


ЗАГАД
Вярхоўнага Галоўнакамандуючага
Камандуючаму войскамі 2-га Украінскага фронта
Маршалу Савецкага Саюза МАЛІНОЎСКАМУ
Начальніку штаба фронта генерал-палкоўніку ЗАХАРАВУ

«**Войскі 2-га Украінскага фронта, пры садзейнічанні войск 3-га Украінскага фронта, акружылі і разграмілі групу нямецкіх войск, якія спрабавалі адступіць ад Вены на поўнач, і авалодалі пры гэтым гарадамі Карнейбург і Фларыдсдорф — магутнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на левым беразе Дуная**», — паведамляла «Звязда».

У ходзе баёў войскі фронту ўзялі ў палон звыш трох тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў і захапілі наступныя трафеі: самалётаў — 32, танкаў і самаходных гармат — 49, палявых гармат — 170, мінамётаў — 220, кулямётаў — 215, аўтамашын — 750, паравозаў — 175, вагонаў — 4 500, складаў з ваеннай маёмасцю — 39.

Войскі 3-га Украінскага фронту, прадаўжаючы наступленне, у гэты дзень авалодалі на тэрыторыі Аўстрыі горадам Санкт-Пельтэн — важным вузлом дарог і моцным апорным пунктам абароны немцаў на рацэ Трайзен. У баях за 14 красавіка войскі фронту ўзялі ў палон 1140 нямецкіх салдат і афіцэраў.

### • У тыле

Да вайны вёска Нарач, што ў Маладзечанскім раёне, была вельмі прыгожай. З аднаго боку яе ахінalі лясы, з другога — вілася блакітнай стужкай рака. Але па гэтай зямлі прайшліся фашысцкія каты і пакінулі свае крывавыя сляды. «**Нямецкія бандыты спалілі 53 гаспадаркі. Спалілі жыўцом усю сям'ю Іосіфа Пятровіча Пескавога, старых Куліцкіх, свяшчэнніка Паўла Сасноўскага з маленькім хлопчыкам, расстралялі 13 чалавек, а 15 чалавек вывезлі на катаргу ў Германію**». Гэта — ахвяры толькі з аднаго населенага пункта нашай Беларусі.

Пасля вайны нарачанцы з выключнай нянавісцю ўспаміналі гэтыя жудасныя дні нямецкай акупацыі: «**За ўсе здзекі над намі помсцяць немцам нашы родныя аднавяскоўцы, якія змагаюцца ў радах Чырвонай Арміі. Мы будзем дапамагаць франтавікам, змагаючыся за высокі ўраджай**», — адзначала дэпутат сельсавета Аляксандра Пескавая.

12 красавіка 1945-га для нарачы быў урачысты дзень. «**На палі, абвеяныя веснавым ветрам, выйшлі аратыя, баранавальшчыкі, сейбіты і ўкінулі ў пульхную глебу першыя зерні. Нарачанцы рашылі сеяць адборным насеннем, каб атрымаць багаты ўраджай перамогі. Па прыкладу Ольгі Ванцэвіч жанчыны арганізавалі ачыстку збожжа ўручную — адны ў рашаце падсяваюць, другія — у пачоўках, трэцяя разлажыўшы пасцілку веюць збожжа на вятры**».

Людзям было, мякка кажучы, няпроста, але сяляне сцвярджалі аднадушна: «Хоць цяжкавата, але пасеем, усё пасеем у тэрмін!»

**Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.**

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
16 красавіка 2025 г. № 14 (795)

# ІНІЦЫЯТЫВА. АДЗІНСТВА. ДЗЕЯННЕ. ВЫНІК

## На ІІ Рэгіянальным форуме «Мясцовае самакіраванне ў Магілёўскай вобласці» вывучылі найлепшыя грамадзянскія ініцыятывы і прыцягнулі ўвагу моладзі

Форум праходзіў на Магілёўшчыне з 8 да 11 красавіка з удзелам дэпутатаў усіх узроўняў, прадстаўнікоў выканаўчай улады, мясцовага самакіравання з розных абласцей Беларусі, сістэмы адукацыі, моладзі, прадстаўнічых органаў суб'ектаў Расійскай Федэрацыі. Яшчэ падчас яго адкрыцця важнасць падзеі адзначыў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Леанід ЗАЯЦ. Ён нагадаў, якое вялікае значэнне мясцоваму самакіраванню надае Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Бо гэта сур'ёзная палітычная апора, якая з'яўляецца сувязным звяном паміж насельніцтвам і мясцовымі органамі ўлады. Форум стаў яркай прыкметай таго, як гэта сувязь функцыянуе.




### ЮНЫЯ ЗНАЎЦЫ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ

Формы камунікату ўдзельнікаў форум былі самыя розныя. Упершыню адбыўся відэамост з шырокім прадстаўніцтвам расійскіх дэпутатаў, дзе размова ішла пра тыя напрацоўкі, якія ўжо зроблены, і агучваліся планы, якія пажадана рэалізаваць у бліжэйшы час. У размове ўдзельнічалі прадстаўнікі 17 рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі. Узаемадзеянне расійскіх рэгіёнаў і раёнаў Магілёўскай вобласці развіваецца па шматлікіх кірунках. І агульнае ў гэтай рабоце тое, што ў яе актыўна ўцягваецца мясцовае насельніцтва і моладзь.

Традыцыйнай стала інтэрнэт-віктарына для навучэнскай моладзі і студэнтаў. Сёлета яна была прысвечана тэме «Мясцовае самакіраванне і народаўладдзе ў канстытуцыйнай сістэме ўлады. ЦУР — Павестка 2040». У віктарыне прынялі ўдзел амаль тры тысячы навучэнцаў, у тым ліку школьнікі 10-11 класаў і студэнты ВНУ. Удзельнікам трэба было на працягу 20 хвілін адказаць на 20 пытанняў. Першае месца сярод школьнікаў заваявала вучаніца СШ № 45 Магілёва Сафія Пазнякова. Сярод студэнтаў першае месца — у студэнта БДСГА Максіма Цуранава.

— Юнакі і дзяўчаты адказвалі на даволі складаныя пытанні, — адзначыў **старшыня праўлення Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў, старшыня Чавускага райсавета Анатоль МАЦЮЛІН,** які ўручаў узнагароды пераможцам. — У нас расце годная змена.

### ЁСЦЬ ПРАБЛЕМА? ШУКАЕМ ШЛЯХІ ВЫРАШЭННЯ

У Магілёўскай вобласці працуе 175 Саветаў дэпутатаў усіх узроўняў колькасцю 1720 чалавек, 480 калегіяльных і 7465 аднаасобных органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання агульнай колькасцю больш за 10 тысяч чалавек.

— Дэпутаты мясцовых Саветаў працуюць у шчыльным кантакце з органамі выканаўчай улады, аказваюць істотны ўплыў на сацыяльна-эканамічнае развіццё сваіх раёнаў, а, галоўнае, іграюць ключавую ролю ў вырашэнні канфліктных праблем грамадзян, — адзначыла падчас работы секцыі «Мясцовае самакіраванне ў нашы дні: праблемы і шляхі іх рашэння» **дырэктар Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Паліна ЦЕРАШКОВА.** — Органамі мясцовага самакіравання назапашаны значны вопыт, але неабходна рухацца далей. Дыскусійнае абмеркаванне праблемных пытанняў дазваляе дасягнуць больш эфектыўнага кіравання рэсурсамі, уцягвання грамадзян у працэс прыняцця рашэнняў і рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў.

У рабоце з насельніцтвам дэпутатам даводзіцца сутыкацца з прыкладамі ўтрыманства, абыякавасці, ігнаравання. Сваімі напрацоўкамі, як гэта пераадольваць, падзяліліся прадстаўнікі Мсціслаўскага, Бялыніцкага і Слаўгарадскага раёнаў.

— Сёння ў нас сфарміравана трывалае разуменне грамадскіх ініцыятыў па месцы жыхарства, выбудавана выразная сістэма работы, якая ахоплівае ўсе сферы жыццядзейнасці, — паведаміла **старшыня Мсціслаўскага райсавета Алена КЛЕЯНКОВА.** — Цікавыя ідэі нараджаюцца падчас сустрэч з насельніцтвам, пры аналізе зваротаў жыхароў, грамадскай думкі. Правільны падыход дазваляе аператыўна вырашаць праблемы, якія ўзнікаюць, і карэкціраваць дзейнасць органаў мясцовай улады. Тое, што робяць нашы актывісты, матывавана не толькі ініцыятывай, але і ўнутраным парывам зрабіць жыццё вакол сябе больш камфортным. Галоўнае патрабаванне — асабісты прыклад. Што датычыцца зваротаў грамадзян, то частку з іх мы спрабуем перафарматаваць і вырашыць праблемы разам з заяўнікамі.

А вось як зацікавіць нешта рабіць разам гараджан, калі нават суседзі па пляцоўцы не заўсёды ведаюць адзін аднаго? На думку **дэпутата Магілёўскага аблсавета, старшыні СТГС № 13 Магілёва Іны ГАЛОДНІКАВАЙ,** выбудоўванню адносінаў паміж насельніцтвам і мясцовай уладай дапамагаюць анлайн-апытанкі ў чатах дамавых і вулічных камітэтаў, асвятленне калектыўнай дзейнасці на інтэрнэт-рэсурсах і афіцыйных сайтах.

Вельмі паказальны вопыт работы з насельніцтвам па добраўпарадкаванні населенага пункта дэманструе аграгарадок Ржаўка-1 Слаўгарадскага раёна. **Староста Аксана ДЗЯНІСАВА** расказала пра маштабную работу, якую праводзілі тут з дапамогай насельніцтва, — чысцілі мясцовае возера. Засталося зрабіць добраўпарадкаванне — і можна пачынаць сезон. У перспектыве — набыццё і ўстаноўка дзіцячай пляцоўкі. На гэтыя мэты збіраюцца сродкі, мясцовая аграгаспадарка таксама не застаецца ўбаку.

### УЗНАГАРОДЫ НАЙЛЕПШЫМ

Выніковым мерапрыемствам форуму стала пленарнае пасяджэнне з удзелам сенатараў і дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў.

— Мэты, якія мы ставілі, былі дасягнуты, — рэзюмаваў **член Савета Рэспублікі, старшыня Магілёўскага аблсавета Аляксандр ГАРОШКІН.** — Наша галоўная задача заключалася ў кансалідацыі грамадства на мясцовым узроўні, падтрымцы ініцыятыў грамадзян і больш шырокім уцягванні людзей у жыццё Прыдняпроўскага краю, каб палепшыць дабрабыт кожнага чалавека, зрабіць яго больш змястоўным.

Урачыстым момантам стала ўручэнне ўзнагарод пераможцам абласнога спаборніцтва сярод органаў мясцовага самакіравання па выніках мінулага года. Сярод сельскіх Саветаў дэпутатаў першае месца — ў Вішоўскага сельсавета Бялыніцкага раёна. На другім і трэцім месцах — Любоніцкі сельсавет Кіраўскага раёна і Вяззеўскі сельсавет Асіповіцкага раёна.

Найлепшым калегіяльным органам тэрытарыяльнага самакіравання стаў № 4 Ленінскага раёна Бабруйска. На другім і трэцім месцах — СТГС мікразоны № 13 Кастрычніцкага раёна Магілёва і мікразона № 2 «Савецкая» Крычава.

Сярод аднаасобных органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання найлепшай прызнана работа старасты аграгарадка Баравіца Кіраўскага раёна Святланы Вараб'ёвай. Другое і трэцяе месца занялі старасты населеных пунктаў Несцерава Падсалтанаўскага сельсавета Мсціслаўскага раёна і Ржаўка-1 Васьковіцкага сельсавета Слаўгарадскага раёна Алена Хліманкова і Аксана Дзянісава.

Ганаровыя граматы Магілёўскага аблсавета атрымалі староста пасёлка Глуша Глушанскага сельсавета Бабруйскага раёна Васіль Амялюсік, старшыня КОТГС аграгарадка Падлужжа Краснагорскага сельсавета Мсціслаўскага раёна Галіна Надтачэева і старшыня Каменскага сельсавета Чавускага раёна Вольга Рэмез.

### ДЛЯ ПАДТРЫМКІ ІНІЦЫЯТЫЎ

Мясцовае самакіраванне застаецца адным з найважнейшых складнікаў беларускай дзяржаўнасці, таму што аказвае непасрэдны ўплыў на якасць жыцця людзей — такім меркаваннем падчас форума падзяліўся **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА.**

— У апошнія гады мы назіраем пазітыўныя змены ў рабоце мясцовага самакіравання, — падкрэсліў ён. — Рэалізавана шмат цікавых ініцыятыў, і, што немалаважна, бачны водгук людзей. Насельніцтва ўцягнута ў вырашэнне пытанняў, якія ўплываюць на паўсядзённае жыццё. Звароты грамадзян улічваюцца пры фарміраванні бюджэту. У 2025 годзе кожнаму сельсавету выдзелена па 10 тысяч рублёў. Калі прапануецца нешта цікавае і значнае, можам павялічыць суму. Акрамя таго, 400 тысяч рублёў прадугледжана на развіццё па праграме падтрымкі грамадзянскіх ініцыятыў. Усё гэта стварае ўмовы для ўдзелу насельніцтва ў кіраванні сваімі тэрыторыямі і фарміруе імідж улады.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота БелТА.**


**ООО «СидНеА» организует конкурсные торги**

| Дата и время проведения | Предмет (право на заключение договоров купли-продажи/аренды) | Начальная цена: сумма в белорусских рублях, эквивалентная долларам США по курсу НБ РБ на день проведения торгов | Общая площадь | Конкурсное обеспечение в бел. руб. | Срок заключения договора купли-продажи/аренды |
|---|---|---|---|---|---|
| **15.05.2025 10.00** | Продажа жилого дома с инв. 600/С-183251, по адресу: Минская обл., Минский р-н, Петришковский с/с, д. Чернявщина, ул. Центральная, 1Б | 133000 | 102,2 кв. м | 2500 | 90 |
| **15.05.2025 11.00** | Продажа дачного дома с инв. 600/С106054, по адресу: Минская обл., Минский р-н, Петришковский с/с, СТ «ЛУКОМОРЬЕ», д. 18 | 14000 | 63,8 кв. м | 2500 | 90 |
| **15.05.2025 12.00** | Продажа дачного дома с инв. 600/С47161, по адресу: Минская обл., Минский р-н, Юзуфовский с/с, СТ «Ясная радуга», д. 1 | 59900 | 108,1 кв. м | 2500 | 90 |

**Повторные конкурсные торги**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **24.04.2025 13.00** | Продажа квартиры с инв. № 500/D-576081, по адресу: г. Минск, ул. Асаналиева, д. 22/3, кв. 54 | 92000 | 64,3 кв. м | 2500 | 90 |

Торги состоятся по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7 этаж. Срок внесения конкурсного обеспечения и приема заявлений с прилагаемыми к нему документами прекращается за один рабочий день до проведения торгов по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7 этаж. Конкурсное обеспечение вносится на р/с BY14MTBK30120001093300123688 в ЗАО «МТБанк», БИК (код) MTBKBY22. Победитель торгов в день проведения подписывает протокол о результатах торгов. Иные условия проведения объявленных конкурсов: право подачи и подписания заявления о государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав предоставляется покупателю. Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с правилами проведения конкурсов по продаже (аренде) имущества ООО «СидНеА», утвержденным приказом директора от 05.03.2024 № 9-ОД. Организатор вправе отказаться от конкурсов (повторного конкурса) в любое время до начала торгов. Телефон для справок (+37529) 171-50-50.

УНП 193734126

МОЦНЫЯ РЭГІЁНЫ

# ПОГЛЯД ЗА ГАРЫЗОНТ

## Магілёўшчына першая сярод рэгіёнаў распрацавала ўласную Стратэгію рэгіянальнага развіцця

У Магілёўскай вобласці падвялі вынікі V Рэгіянальнага форуму па ўстойлівым развіцці.




Удзел у форуме прынялі прадстаўнікі выканаўчай улады, дэпутаты, члены абласной рабочай групы па ўстойлівым развіцці, СЭЗ «Магілёў», абласных асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў, прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў, моладзь.

На пленарным пасяджэнні ў Палацава-паркавым ансамблі ў аграгарадку Жылічы Кіраўскага раёна былі агучаны прыярытэтныя кірункі развіцця Магілёўскага рэгіёну ў рамках абноўленай Стратэгіі ўстойлівага развіцця вобласці да 2040 года.

Найважнейшым з іх з'яўляецца рэсурсазберажэнне. Спікеры расказалі пра пілотныя ініцыятывы па ўкараненні прынцыпаў цыркулярнай эканомікі і рэсурсазберажэння на прадпрыемствах і ў арганізацыях Магілёўскай вобласці, аб працэсе ўцягвання насельніцтва ў прыняцце рашэнняў на мясцовым узроўні. Сваімі напрацоўкамі падзялілася моладзь — пераможцы абласнога конкурсу лепшых практык па рэалізацыі Стратэгіі ўстойлівага развіцця Магілёўскай вобласці на перыяд да 2035 года. Іх узнагароджанне таксама адбылося ў рамках форуму.

— Праграма развіцця ААН па дасягненні Мэт устойлівага развіцця супадае з тым шляхам, па якім ідзе краіна, — рэзюмаваў **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, нацыянальны каардынатар па дасягненні МУР Сяргей ХАМЕНКА.** — Пасыл выражаецца ў некалькіх словах — дзяржава для народа, дзяржава ў імя народа. Думаю, прадстаўнікі ААН разумеюць, што гэта не проста словы. Гэта справы, якія спачатку былі прынятыя рашэннем кіраўніка дзяржавы, а зараз рэалізуюцца нашым урадам, у тым ліку ў рэгіёнах.

Сяргей Хаменка падкрэсліў, што рэгіён актыўна выкарыстоўвае сродкі донараў і рэалізуе праекты ў сацыяльнай, эканамічнай і экалагічнай сферах.

— На сённяшні дзень ужо разгледжана Праграма развіцця Рэспублікі Беларусь — Стратэгія развіцця да 2040 года, — адзначыў ён. — Кажучы словамі Прэзідэнта, «мы глядзім за гарызонт, мы робім усё для таго, каб нашы дзеці і ўнукі, іх дзеці і ўнукі жылі ў мірнай і развітай дзяржаве».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з тэлеграм-канала Савета Рэспублікі.**

# ВЫРАШАНА БОЛЬШ ЗА СТО ПЫТАННЯЎ

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

## У склад Лепельскай выбарчай акругі № 23 уваходзяць Бешанковіцкі, Чашніцкі і Лепельскі раёны з агульнай колькасцю выбаршчыкаў больш за 60300 чалавек

Член Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віктар Азаронак расказаў аб тым, чым жыве акруга і якія добрыя справы ўжо ўдалося рэалізаваць.



Прыёмы грамадзян Віктар Азаронак імкнецца праводзіць пераважна ў сельскай мясцовасці, каб кожны чалавек, незалежна ад узросту і магчымасцяў, мог асабіста звярнуцца да яго па дапамогу. Асноўныя пытанні, якія ўздымаюць выбаршчыкі, — работа жыллёва-камунальнай гаспадаркі, транспарт, гандаль, землеўпарадкаванне і землекарыстанне. Кожнае пытанне Віктар Уладзіміравіч бярэ на кантроль да поўнага вырашэння, у агульным на сённяшні дзень вырашана больш за 100 узнятых пытанняў.

Так, у выніку сумеснай работы з мясцовымі выканаўчымі органамі ўлады было адноўлена дарожнае пакрыццё ў некалькіх вёсках Лепельшчыны; адноўлены выпуск хлеба на Новалукомльскай вытворчасці Аршанскага хлебазавода. У ліку добрых спраў дэпутата Азаронка — захаванне прадуктовай крамы ў Лепелі, вырашэнне пытанняў, якія тычыліся падключэння электраацяплення жылых памяшканняў у Лепелі, аграгарадку Стаі і інш.

«Вядома, імкнуся па магчымасці прымаць удзел у грамадскім жыцці Бешанковіцкага, Лепельскага, Чашніцкага раёнаў, якія ўваходзяць у склад маёй выбарчай акругі. Разам з мясцовым насельніцтвам і органамі ўлады, грамадскімі арганізацыямі ўдзельнічаем у святах і акцыях: «Дай лесу новае жыццё», «Нашы дзеці», «Ад усёй душы», «Клопат» і інш.», — расказвае Віктар Уладзіміравіч.

«У сваёй дэпутацкай дзейнасці праводжу работу па падтрымцы і развіцці раней усталяваных міжнародных сувязяў з мэтай прыцягнення сродкаў міжнародных дабрачынных арганізацый для задавальнення запытаў жыхароў акругі: у рамках супрацоўніцтва з Міжнародным дабрачынным грамадскім аб'яднаннем «ЭкаБудаўнік» і грамадскай арганізацыяй «Дамы замест Чарнобыля» летам 2024 года быў праведзены рамонт аднаго з дамоў сямейнага тыпу ў Лепелі», — дзеліцца Азаронак.

Перадача вопыту маладому пакаленню і прыцягненне моладзі да актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці краіны — яшчэ адзін напрамак дзейнасці дэпутата. Віктар Уладзіміравіч рэгулярна сустракаецца са школьнікамі і студэнтамі, адкрыты дыялог з працоўнай моладдзю рэалізуецца ў рамках серыі дыялогавых пляцовак «Маё пытанне — дэпутату», якія былі праведзены ва ўсіх раёнах акругі. Напярэдадні знакавай для нашай краіны даты — 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне — тэмай сустрэч з падрастаючым пакаленнем становіцца захаванне гістарычнай памяці.

«Кожны з нас працуе на карысць сваіх людзей, каб у рэгіёнах павышалася якасць жыцця, каб людзі хацелі заставацца і развівацца ў сельскай мясцовасці. А мы, дэпутаты, імкнёмся ўсімі сіламі дапамагчы стварыць такія ўмовы», — заключыў Віктар Азаронак.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Остромечево», 225034, Брестская обл., Брестский район, аг. Остромечево, пл. Октябрьская, д. 2 |
| **Оператор/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов:**
**Здание** (Здание неустановленного назначения), инв. № 100/С-90020, общ. пл. 350,5 кв. м, по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Тереспольская, 24А.
**Сведения о земельном участке:**
общ. пл. 0,1086 га предоставлен продавцу для строительства и обслуживания здания неустановленного назначения на праве аренды по 30.11.2028

**Начальная цена лота №1, с НДС 20 % – 96 444,00 бел. руб.**

**Шаг** электронных торгов составляет 5 % от начальной цены по всем лотам.
**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** календарных дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, такая оплата должна быть произведена в течение **20 (двадцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее, чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано газете «Звязда» от 01.02.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 14.05.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются: по 13.05.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Организатор: государственное предприятие **«Жилищное коммунальное хозяйство № 2 Фрунзенского района г. Минска»,**
*220104, г. Минск, ул. Матусевича, 42, тел. +375 (17) 3600685.*

Торги проводятся **21.05.2025 г.** ЭТП «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.**

**Л/АВТОМОБИЛЬ GEELY SC7,**
**2014 г., черный – 10000 BYN**

Окончание приема заявлений – **16.05.2025, до 15.00.**
Подробная информация на сайте: **www.et.butb.by.**

УНП 192605364

ИНФОРМАЦИЯ
о проведении открытого аукциона
22 мая 2025 г.
по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Смолевичи

***Организатор аукциона: Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125.***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Смолевичи, ул. Михайловская, 4 | 624850100 008000890 | 0,1307 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 35 000 |
| 2 | г. Смолевичи, ул. Владимира Купревича, 46 | 624850100 008000886 | 0,15 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 31 000 |

Аукцион состоится **22 мая 2025 г. в 15.00** в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125, зал заседаний.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by, на сайте Минского областного исполнительного комитета.

УНП 600014139

МЯСЦОВЫ ЧАС

# САКРЭТ ПАСПЯХОВАСЦІ — У КАМАНДНАЙ РАБОЦЕ

## Які вопыт Шчучынскага раённага Савета дэпутатаў запатрабаваны ў калег, як на практыцы рэалізуецца «зямельная амністыя» і чаму важна падключаць ва ўсе працэсы моладзь



На чале народных выбраннікаў Шчучыншчыны вось ужо сёмы год знаходзіцца вопытны кіраўнік з больш як 30-гадовым стажам дзяржслужбы, дэпутат раённага Савета пяці скліканняў. Для старшыні Шчучынскага раённага Савета дэпутатаў Ганны ХВЯДЗЮК служэнне Радзіме, людзям, якія аказалі ёй высокі давер, — яе жыццёвая місія. Старшыня райсавета пераканаўчая, што без каманды патрыётаў і прафесіяналаў дасягнуць значнага выніку нельга, а таму толькі сумеснымі намаганнямі выканаўчай і прадстаўнічай улады можна рухацца наперад.

***— Ганна Станіславаўна, на пасяджэнні 13-й сесіі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў, у якім узяла ўдзел спікер Савета Рэспублікі Наталля Качанава, разглядаліся пытанні рэалізацыі рэгіянальнага комплексу мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы «Сацыяльная абарона». Наколькі актуальна гэта для Шчучыншчыны?***

— Вельмі актуальна, бо больш за 12 тысяч чалавек, якія пражываюць на нашай тэрыторыі, — гэта людзі пенсіённага ўзросту. Імкнёмся дайсці да кожнага. У аддаленых населеных пунктах, дзе складана знайсці сацыяльнага работніка, выкарыстоўваюцца розныя формы сацабслугоўвання. Гэта і выязное абслугоўванне, і замяшчальныя сем'і, у трох бальніцах створаны аддзяленні сястрынскага догляду. У г. п. Астрына функцыянуе аддзяленне кругласутачнага прабывання тэрытарыяльнага цэнтра, у якім адначасова жывуць 25 чалавек. Дапамогу людзям аказваюць медыцынскія работнікі, працуюць аглядныя камісіі. У гэтай справе вельмі важна своечасова ўзаемадзейнічаць са старастамі, сельвыканкамамі — гэта паскарае вырашэнне многіх пытанняў.

***— Як на тэрыторыі раёна вядзецца работа з пустуючымі хатамі? Ведаю, што ваш вопыт пераймаюць іншыя...***

— Гэта работа на тэрыторыі краіны, а адпаведна і раёна, вядзецца з 2006 года. За гэты час дзейнічалі розныя ўказы. Цяпер арыенцір для нас — Указ Прэзідэнта № 116 «Аб адчужэнні жылых дамоў у сельскай мясцовасці і ўдасканаленні работы з пустуючымі дамамі». З уступленнем у сілу дакумента мы разам са службамі райвыканкама сістэматызавалі сваю дзейнасць, выпрацавалі алгарытм работы з пустуючымі дамамі. Дарэчы, у дапамогу і нам, і людзям Адзіны рэестр пустуючых дамоў, які існуе з 1 студзеня 2023 года. Кожны грамадзянін з любога пункта Беларусі можа ўбачыць, якія дамы знаходзяцца ў рэестры, пры жаданні ажыццявіць пакупку за адну базавую, калі няма іншых прэтэндэнтаў, або праз аўкцыён, калі такія прэтэндэнты ёсць. Летась, напрыклад, у нас на набыццё аднаго дома на тэрыторыі Каменскага сельсавета было каля 10 прэтэндэнтаў. У выніку дом прадалі амаль за 29 тысяч беларускіх рублёў.

А ўвогуле, пачынаючы з 2006 года, на тэрыторыі раёна ўдалося знесці больш за 1700 хат. На гэта было выдзелена каля 476 тысяч беларускіх рублёў. У зносе дамоў нам вельмі сур'ёзна дапамагаюць сельскагаспадарчыя арганізацыі.

***— Другі бок пытання — наколькі людзі, у тым ліку гараджане, зацікаўлены ў набыцці пустуючай хаты ў сельскай мясцовасці?***

— Усё залежыць ад тэрыторыі, на якой яна размешчана. Асабліва цікавасць, калі дом знаходзіцца недалёка ад горада або ў жывапісным месцы. У Шчучынскім сельсавеце ўвогуле няма праблем з пустуючымі хатамі. У актуальнай базе рэестра на бягучы момант у Шчучынскім раёне знаходзіцца 180 пустуючых дамоў, 145 з іх нашымі сельскімі выканкамамі ўключаны сёлета. Людзей таксама прываблівае спрошчаны парадак набыцця дамоў, калі паміж сабой дамаўляюцца спадчыннік домаўладання і той, хто жадае яго набыць. Прадстаўнікі абодвух бакоў прыходзяць у сельскі выканкам і афармляюць дагавор куплі-продажу па спрошчанай форме — у выніку пытанне вырашаецца хутка.

***— Дзякуючы абноўленаму Кодэксу Рэспублікі Беларусь аб зямлі — так званай зямельнай рэформе — паўнамоцтвы мясцовых органаў улады значна пашырыліся. Ці аблегчылі новаўвядзенні работу ў гэтым кірунку?***

— У Шчучынскім раёне зямельная рэформа працуе ва ўсю. Праектны інстытут «Гроднагіпразем» у 2022 годзе аблічбаваў мясцовасць і вылучыў участкі, якія, па іх меркаванні, з'яўляюцца самавольна занятымі. Нашы спецыялісты ў сціслыя тэрміны абследавалі каля пяці тысяч участкаў, якія, па папярэдніх прагнозах, з'яўляліся самавольна занятымі. Былі высла违ны апавяшчэнні, каб людзі звярнуліся ў свой сельвыканкам. Пытанне па большасці ўчасткаў было знята: дзесьці былі няправільна ўстаноўленыя межы, дзесьці знайшліся патрэбныя дакументы. Па 13 фактах самавольна занятыя ўчасткі былі вернуты папярэднім землекарыстальнікам. 138 грамадзян і юрыдычных асоб звярнуліся з заявай аб узаконьванні сваіх участкаў. У выніку мясцовымі выканкамамі на бягучы момант прыняты 74 такія рашэнні. Пры гэтым сума плацяжоў, унесеных за правы легалізацыі, склала звыш 50 тысяч беларускіх рублёў. Дарэчы, плата за легалізацыю зямлі ў сельскіх населеных пунктах невялікая. Напрыклад, у аграгарадку Дэмбрава чалавек, які самавольна заняў 73 квадратныя метры зямлі, заплаціць за легалізацыю 31,91 беларускага рубля. У Шчучыне сумы іншыя. Але ў грамадзян ёсць права выбару: або ўзаконіць участак, або прывесці яго ў адпаведнасць з дакументамі. Вядома, час яшчэ ёсць: «зямельная амністыя» працуе да 1 студзеня 2028 года. Аднак настройваем людзей на тое, каб не цягнулі.

***— Пытанне добраўпарадкавання, якое заўсёды актуальнае для сельскай мясцовасці, набыло асаблівае гучанне ў аб'яўлены кіраўніком дзяржавы Год добраўпарадкавання. Якія ў гэтай сувязі задачы паставілі перад сельсаветамі?***

— Для нас гэта работа не новая, але мы вельмі рады, што гэты год аб'яўлены Годам добраўпарадкавання ў рамках пяцігодкі якасці. Беларусь заўсёды славілася сваёй прыгажосцю, чысцінёй. Усе, хто прыязджае да нас у краіну, звяртаюць увагу на гэта. Імідж добраўпарадкаванай, прыгожай краіны, і ў прыватнасці Шчучынскага раёна, мы павінны захаваць. У нас прыняты раённы план па добраўпарадкаванні. У лютым традыцыйна мы правялі пашыраныя сесіі сельскіх Саветаў дэпутатаў, дзе разгледзелі комплекс мерапрыемстваў па забеспячэнні камфортнага жыцця насельніцтва. Асаблівую ўвагу ўдзялілі пытанням добраўпарадкавання і, перш за ўсё, прыцягненню насельніцтва да навядзення чысціні. На бягучы момант на сяле праведзена 12 суботнікаў. Мяне радуе, што цяпер не толькі органы ўлады ініцыіруюць правядзенне такіх мерапрыемстваў, а людзі самі збіраюць суседзяў і бяруцца за справу. Спадзяюся, гэты год пакажа, на якім узроўні знаходзіцца ўзаемадзеянне ўлады і людзей, якія жывуць у канкрэтным населеным пункце.

***— Шмат увагі мясцовыя дэпутаты ўдзяляюць і грамадзянскім ініцыятывам...***

— Першая ініцыятыва грамадзян на тэрыторыі раёна была спартыўнага кірунку. Пры ўзаемадзеянні з наведвальнікамі Шчучынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання былі набыты трэнажоры. Цяпер нашы актыўныя прадстаўнікі «сярэбранага», «залатога» ўзросту прыходзяць сюды займацца фізічнай культурай і спортам. Летась разам з жыхарамі Астрыны і дэпутацкім корпусам рэалізавалі ініцыятыву «ЭкаДабрыню ствараем разам», якая датычыцца ачысткі вадасцёкаў ракі Астрынкі ў гэтым гарадскім пасёлку. Людзі задаволены, бо пачала вырашацца праблема, якая доўгі час іх турбавала, — падтапленне ўчасткаў. Спадзяёмся, што новая ініцыятыва, або, лепш сказаць, ідэя, не прадаўжэнне, будзе падтрымана і працягнецца.

**Вераніка КАНЮТА.**

*г. Шчучын.*


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Минский домостроительный комбинат», 220015 г. Минск, ул. Пономаренко, 43 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

| № лота | Наименование лота | Начальная цена лота, с НДС 20 %, руб. |
|---|---|---|
| 1 | Машино-место с инвентарным номером 500/D-7988227728, общая площадь – 13,7 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-26 | 21 360,00 |
| 2 | Машино-место с инвентарным номером 500/D-7988227729, общая площадь – 13,6 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-27 | 21 360,00 |
| 3 | Машино-место с инвентарным номером 500/D-7988227730, общая площадь – 13,3 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-35 | 21 360,00 |
| 4 | Машино-место с инвентарным номером 500/D-7988227731, общая площадь – 13,5 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-36 | 21 360,00 |
| 5 | Машино-место с инвентарным номером 500/D-7988227732, общая площадь – 13,3 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-37 | 21 360,00 |

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее, чем за три дня до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 27.03.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 30.04.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 26.04.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Полиграфкомбинат им. Я. Коласа»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 19.05.2024.**

**Лот № 1:** Изолированное помещение № 1 с инв. № 443/D-13019.

Начальная цена с НДС 20 % – 595 200,00 руб.

Изолированное помещение № 1 находится в капитальном строении с инв. № 443/C-17890, которое размещено на земельном участке с кадастровым № 425650100001000488. Площадь – 0,0407 га. **Обременения:** Аренда. **Местонахождение:** Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Советская, 3-1. **Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 15.05.2025 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182

Утерянный страховой полис квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) в количестве 1 шт., форма 1СУ серии **ВВ** № 1731518, в представительстве Белгосстраха по Молодечненскому району **считать недействительной.** УНП 100122726

Утерянное служебное удостоверение сотрудника Издательского дома «Звязда» № 49 на имя ИВАНЧИКОВА Виктора Александровича, выданное 21.09.2025 г., **считать недействительным.**


**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Палаты прадстаўнікоў трэцяга склікання БАРШЧОВА Уладзіміра Мікалаевіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(Организатор торгов и Оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 8 (017) 516 80 64)
по поручению **управления по сельскому хозяйству и продовольствию Стародорожского райисполкома**
(222910, г. Старые Дороги, ул. Пролетарская, 38)
проводит повторный открытый аукцион

**по продаже легкового автомобиля SAMAND TU5,**

**2010 г. в., кузов (VIN) Y3W2PSMTUAUNS1001, регистрационный знак 8217 НЕ-5, цвет – светло серый), находящегося по адресу: Минская область, г. Старые Дороги, ул. Пролетарская, 38.**

**Начальная цена** (без НДС) – **960,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **96,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 80 %.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by. Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.
*Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 14.01.2025, 18.03.2025.*

Электронные торги состоятся **08.05.2025** в **10.00**.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.05.2025** до **17.00.**

**Тел.: 8 (017) 516-80-65; 8 (029) 136-31-11.**
**Тел для осмотра транспорта 8 (01792) 5-51-31, время осмотра с 9.00 до 16.00 понедельник – пятница.**

УНП 600026756



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Заславльбурвод»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 30.04.2025.**

**Лот № 1 в составе:**
1. **Административно-производственный корпус,** инв. № 630/С-46558, 700 кв. м;
2. **Склад,** инв. № 630/С-46559, 269 кв. м;
3. **Проходная,** инв. № 630/С-46560, 54,9 кв. м;
4. **Здание мастерской,** инв. № 630/С-81238, 106,9 кв. м.

Адрес лота:
Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Змитрока Бядули, 15/1; 15/2; 15; 15/3.
Обременение: аренда.
Начальная цена с НДС 20 % – 168,00 руб.
(цена каждого объекта лота равна базовой величине)
Задаток – 16,80 руб.
Земельный участок 642000000001001543, 1,0031 га.
Право постоянного пользования.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 25.04.2025 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 05.05.2025.**

**Лот № 1:** Помещение универсама с инв. № 200/D-168410, площадь – 1935,9 кв. м.

Адрес: Витебская обл., г. Витебск, ул. Правды, 64А-1.
Земельный участок № 240100000001006088, 0,4013 га.
Право постоянного пользования.

Обременения: Аренда, Ипотека, Сервитут.

Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.
Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

Начальная цена с НДС 20 % – 1 842 112,12 долларов США.
Задаток – 576 452,15 руб. **Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 30.04.2025 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182


# «САМАЕ ГАЛОЎНАЕ — ЗГУРТАВАННЕ ПРАЦОЎНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ»

2025 ГОД ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ

## Як Беларускі прафсаюз банкаўскіх і фінансавых работнікаў далучыўся да рэспубліканскага суботніка



Рэспубліканскі суботнік з размахам прайшоў па ўсёй краіне. Міністэрствы і ведамствы, арганізацыі і прадпрыемствы — уся Беларусь далучылася да гэтай добрай акцыі па навядзенні парадку на зямлі. Сярод тых, каму не абыякава наша асяроддзе, — Беларускі прафесійны саюз банкаўскіх і фінансавых работнікаў. Яго члены разам з калектывам ЗАТ «АСБ Агра-Кухцічы» ў гэты дзень працавалі ва Узбзенскім раёне Мінскай вобласці. Выбар месца правядзення суботніка для прадстаўнікоў прафсаюза быў зроблены невыпадкова. Больш падрабязна пра навядзенне парадку на зямлі, дапамозе аграрыям і фінансаванні рамонтных работ на памятных манументах карэспандэнту «Звязды» расказаў старшыня Беларускага прафесійнага саюза банкаўскіх і фінансавых работнікаў Мікалай ШУМ.

«Гістарычна так склалася, што гэта гаспадарка ўваходзіць у структуру нашага Беларускага прафсаюза банкаўскіх і фінансавых работнікаў. Разам з імі мы рэгулярна праводзім розныя сумесныя мерапрыемствы. Так, напрыклад, падчас правядзення пасяўных і ўборачных работ мы заўсёды заахвочваем нашых аграрыяў-перадавікоў. І Рэспубліканскі суботнік, у якім мы разам з аграрыямі ўзялі ўдзел, таксама не стаў выключэннем. Такія мерапрыемствы па добраўпарадкаванні асабліва важна праводзіць у юбілейны год нашай Вялікай Перамогі».

Мікалай Мікалаевіч расказаў, што на тэрыторыі буйной гаспадаркі нямала помнікаў: «Таму падчас суботніка мы і працавалі на такіх значных аб'ектах. Акрамя таго, наш прафсаюз фінансуе правядзенне рамонтных работ на гэтых помніках, удзяляе добраўпарадкаванню такіх важных месцаў асаблівую ўвагу. Ды і работы на іх — насычаныя. На адным з помнікаў, напрыклад, неабходна яшчэ пакласці плітку, паставіць бардзюр... Прыемна, што і самі банкаўскія ўстановы аказваюць садзейнічанне ў гэтай добрай справе».

Паводле слоў старшыні, на Рэспубліканскім суботніку гэтым разам працавала больш як 20 членаў прафсаюза: «У выніку якаснай і зладжанай работы мы сапраўды навялі належны парадак: пафарбавалі, пабялілі, выграблі траву і пустазелле. Сачыць за такімі месцамі, займацца іх добраўпарадкаваннем, захоўваць памяць аб той вайне, перадаючы яе з пакалення ў пакаленне, — наша пачэсная задача».

Мікалай Шум расказаў, што ўжо больш за пяць гадоў ён працуе ў сістэме прафсаюзаў. За плячыма — вялікі вопыт работы ў органах дзяржаўнага кіравання, у свой час Мікалай Мікалаевіч быў нават старшынёй райвыканкама. Паводле яго слоў, суботнікі — гэта слаўная традыцыя, якая захавалася яшчэ з савецкіх часоў. Такія акцыі па навядзенні парадку на зямлі закліканы з'яднаць людзей: «Калі на мерапрыемствы па навядзенні парадку выходзіць увесь раён, працуе на самых розных аб'ектах — гэта сапраўды аб'ядноўвае людзей. Я лічу, што акрамя самога добраўпарадкавання гэта яшчэ адна важная мэта суботнікаў».

Старшыня звярнуў увагу, што перад прафсаюзам банкаўскіх і фінансавых работнікаў стаіць мноства задач: «Але самая галоўная з іх — згуртаванне працоўных калектываў. Таму вельмі важна праводзіць такія мерапрыемствы. На іх адразу можна ўбачыць: хто сапраўдны патрыёт, які хварэе за сваю краіну і агульную справу».

Ён расказаў, што да рэспубліканскага суботніка іх прафсаюз узяў актыўны ўдзел у акцыі «Дай лесу новае жыццё». У такіх добраахвотных пачынаннях члены прафсаюза ўдзельнічаюць на пастаяннай аснове. «Удзел у акцыях па пасадцы дрэў, асабліва на тэрыторыях, якія больш за ўсё пацярпелі ад урагану, стаў для нас ужо добрай традыцыяй. Кожны тыдзень мы падводзім вынікі. Так, за мінулы тыдзень члены нашага прафсаюза пасадзілі 33 гектары лесу, яшчэ раней — 49,1 гектара. І на гэтым работы не спыняцца», — падкрэсліў Мікалай Шум.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Беларускага прафесійнага саюза банкаўскіх і фінансавых работнікаў.**

УНП 100962492


Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by



РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 12 322. Нумар падпісаны ў 19.30 15 красавіка 2025 года.**

# ПАБАЧЫЦЬ САПРАЎДНЫ ТВАР ФАШЫЗМУ...

## Ва ўсіх кінатэатрах краіны заўтра адбудзецца прэм'ера дылогіі «Лагеры смерці» і «Спаленыя вёскі»

Фільмы будуць паказаны ў рамках рэспубліканскай акцыі «Гэта павінен бачыць кожны беларус». У іншых краінах (Расіі, Кітаі, В'етнаме, Сербіі, Калумбіі, Турцыі, Таджыкістане, Аргенціне, ЗША) гэтыя стужкі дэманструюцца ў рамках акцыі «Памятаць. Помнить. Remember». Першымі гледачамі дылогіі сталі журналісты, якіх запрасілі на прэс-паказ у сталічны кінатэатр «Перамога».







Перад паказам выступіў **Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь Андрэй ШВЕД,** і гэта невыпадкова, бо дылогія знятая па ініцыятыве менавіта Генпракуратуры. Ён нагадаў, што нідзе не было такіх маштабаў трагедыі, як на тэрыторыі БССР, і таму нам вельмі важна, ведаючы гісторыю, разумець, што стаіць за сучаснымі падзеямі. «80 гадоў таму нашы з вамі продкі выстаялі ў жудаснай вайне. І наша з вамі задача, наш святы абавязак захаваць памяць аб іх подзвігу, аб тых пакутах, якія ім выпалі. Мы павінны гэта памятаць і перадаць нашым нашчадкам, каб нашы з вамі дзеці, унукі ведалі праўду аб тых жахлівых падзеях і аб тым вялікім подзвігу», — сказаў Андрэй Швед.

